**У. Дз. Кніга** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# ЗНЕШНІЯ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ АДРОЗНЕННІ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ВЯСКОВЫХ ПАСЕЛІШЧ

Кожны народ мае сваю этнічную тэрыторыю, сваю Бацькаўшчыну, дзе жылі яго продкі на працягу многіх стагоддзяў. Наяўнасць этнічнай тэрыторыі дазваляе народу захаваць сябе як этнас, развіваць нацыянальную культуру, якая залежыць ад прыроды з яе разнастайнымі рэсурсамі і прадвызначае напрамкі гаспадарчай дзейнасці, асаблівасці матэрыяльнай культуры, паўсядзённы быт, мову, уплывае на нацыянальны менталітэт. Поруч з агульнымі, характэрнымі для ўсяго этнасу працэсамі, адбываліся больш прыватныя этнакультурныя з'явы ў розных рэгіёнах Беларусі, якія накладвалі адбітак на мясцовую самасвядомасць, што надавала таму ці іншаму рэгіёну спецыфічныя рысы. Культурны ж ландшафт сумежных рэгіёнаў мае пераходныя рысы. Параўнальнае супастаўленне этнаграфічных прыкмет з лінгвістычнымі, фальклорнымі данымі дазваляе вылучыць на тэрыторыі Беларусі шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: *Падзвінне*, або *Паазёр'е, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Усходняе Палессе* і *Заходняе Палессе.*

У працэсе засялення таго ці іншага рэгіёна і гаспадарчага асваення адбавалася акумуляцыя культурных набыткаў, складваліся пэўныя вытворчыя і абрадава-бытавыя традыцыі, пазначалася падабенства ў эканамічным і духоўным жыцці, фарміраваўся рэгіянальны тып культуры. Рэгіянальныя асаблівасці адлюстроўваюць багацце і лакальную разнавіднасць тых або іншых напрамкаў дзейнасці чалавека.

Нас найперш цікавяць адметнасці структуры і знешні воблік паселішч і сялянскіх сядзіб у розных рэгіёнах Беларусі.

Так, па *Падзвінні* найбольш густанаселеным было левабярэжжа Заходняй Дзвіны. Пераважалі маладворныя пасяленні (3–5 сядзіб). "Нейкі своеасаблівы адбітак фаталістычнай падуладнасці прыродзе, – пісаў Ф. Кудрынскі, – ляжыць на знешнім абліччы беларускіх сёл і вёсак, жаданне ўпотай адасобіцца з вачэй". Вясковыя шляхі вызначаліся слабой набітасцю грунту і былі дастаткова вузкімі. Тып забудовы пераважна замкнуты, кампактны: гаспадарчыя памяшканні шчыльна прымыкалі да жылля, утвараючы адзіны жыллёва-бытавы комплекс з крытым дваром (вядомы толькі ў гэтым рэгіёне). У глыбіні сядзібы будавалі гумно і лазню.

МГПУ им. И.П.Шамякина

*Гумно* – комплекс гаспадарчых пабудоў з уласным гумном, сушылкай (асець, ёўня), пуня для саломы і сена. На адкрытай мясцовасці нярэдка ставілі млын-вятрак.

Тыповая планіроўка жылля: хата + сенцы + стопка. Часам у сенцах адгароджвалі катух для дробнай свойскай жывёлы.

*Падняпроўе* займае ўсходнюю частку Беларусі. На характар размяшчэння сельскіх паселішч рэгіёна прыкметна паўплывалі водныя басейны і колькасць урадлівых глеб. Вядомы даследчык народнага жытла С. Максімаў адзначаў у жыхароў схільнасць сяліцца ў лясных краях, воддаль ад вялікіх рэк і праязных дарог. Найбольш заселенай і асвоенай па Падняпроўі была левабярэжная частка. Сістэма рассялення і аблічча вёсак выяўляюць тут пераходныя рысы ад паўночна-ўсходняй да палескай частак Беларусі.

Паселішчы Падняпроўскага рэгіёна адрозніваліся большымі памерамі: прыкладна 15–30 двароў. Распаўсюджанымі тыпамі планіроўкі традыцыйнага жылля былі: хата + сенцы + клець + трысцен. Прычым ён выконваў ролю сенцаў. *Свіран* (амбар для зерня) ставілі насупраць хаты. Хлеў прымыкаў да жылля праз павець ці ставіўся ў глыбіні двара. Канструкцыйна жыллё было зрублена з круглых бярвенняў, звязаных у просты вугал.

*Цэнтральны рэгіён* – гэта асноўная частка Мінскай і заходняя частка Магілёўскай абласцей. Характар сельскіх пасяленняў названага рэгіёна прыкметна мяняецца з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад ад параўнальна невялікіх вёсачак да буйных мнагадворных сёл, што размешчаны на адкрытай мясцовасці. Трэба адзначыць, што ў буйных вёсках бессістэмны тып размяшчэння пасяленняў, бессістэмны характар размяшчэння падвор’яў змяніўся на вулічную планіроўку.

Найбольш тыповым для рассяленняў Цэнтральнай Беларусі быў пагонны двор: на адзін бок размяшчаліся хата, клець хлява, а на другі – гумно, адрына, студня. Жыллё было 3-х і 2-х камернае: хата + сенцы + клець, хата + сенцы. У аснове канструкцыі будоўлі ляжаў зруб з сасновых бярвенняў, звязаных у просты, або чысты (нямецкі) вугал.

Вёскі *Панямоння*, як правіла вулічнага тыпу, размяшчаліся на адкрытай мясцовасці ўздоўж дарог і гандлёвых трактаў, паблізу рэк і азёр.

Характэрнай асаблівасцю размяшчэння сялянскай сядзібы гэтага рэгіёна была пагонная сістэма, калі гумны, пуні для сена ставіліся на пэўнай адлегласці ў канцы сядзібы. Там жа нярэдка будавалі свірны. Тыповая планіроўка сялянскага двара: хата + сенцы + камора. У больш заможных гаспадароў вылучаліся асобныя кухні, спальні, святліцы.

Важна зазначыць, што народная архітэктура ў Панямонні развівалася некалькі хутчэй, чым у другіх рэгіёнах, і актыўна пераймала канструкцыйныя формы захаду, удала перапрацоўваючы іх у спалучэнні з традыцыйнымі.

МГПУ им. И.П.Шамякина

На *Усходнім Палессі* сельскія пасяленні былі размеркаваны нераўнамерна. Найбольш густанаселенымі з'яўляліся Хойніцка-Брагінскае, Юравіцкае, Мазырскае ўзвышшы. Побач з мнагадворнымі сустракаліся невялікія пасяленні ў 5–10 хат, засценкі і выселкі. Тыповыя палескія двары замкнутыя і Г-падобныя. Будоўлі размяшчаліся ў наступным парадку: хата + сенцы + стопка + павець + хлявы + адрына. Сенцы на Палессі – паўжылое памяшканне – летам служылі спальняй.

На *Мазыршчыне* замест стопак часта будавалі пограбы (лёхі), якія ўяўляюць сабой зрубны характар з сасны або асіны, злучаных паміж сабой у просты вугал.

Такім чынам, у аснове варыянтнага багацця беларускага народнага дойлідства ляжаць шматгранныя народныя традыцыі, якія ўзмацняліся індывідуальным характарам вытворчасці ва ўмовах адноснай ізаляванасці і паспрыялі фарміраванню самабытных архітэктурных рыс, што мелі для іх жыццёва важнае значэнне.

МГПУ им. И.П.Шамякина